**В. Ю. Себруковіч,** *аспірант.*
Навуковы кіраўнік – **Я. Л. Краснова,**
*кандыдат культуралогіі, дацэнт*

# РЭАЛІЗАЦЫЯ АНЛАЙН-ПРАЕКТАЎ ЯК ФОРМА ТРАНСЛЯЦЫІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў СУЧАСНАЙ МЕДЫЯПРАСТОРЫ БЕЛАРУСКІХ МУЗЕЯЎ

Імклівыя тэмпы экспансіі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у сферы культуры, і, у прыватнасці, музейнай галіне, патрабуюць дынамічнай рэакцыі на дадзеныя пераўтварэнні. Перад музейнымі інстытуцыямі паўстала праблема, звязаная з запатрабаванасцю, актуальнасцю і, самае галоўнае, канкурэнтаздольнасцю ў сучаснай медыяпрасторы.

Для таго, каб заставацца заўважаным сярод мноства актыўнасцей сацыякультурнай сферы, музей вымушаны у гэтым сэнсе кіравацца законамі масмедыя: быць адкрытым, мабільным, прыцягальным, аператыўным у рэагаванні на змены [4].

Важнымі аспектамі ў дзейнасці сучаснага музея бачацца інтэрактыўнасць і віртуальнасць. Адбываецца актыўнае ўжыванне ў музейнай айчыннай практыцы, а затым выкарыстанне ў асобных навуковых тэарэтычных разважаннях тэрмінаў «інтэрактыўны музей», «інтэрактыўная экскурсія», «віртуальны музей», «віртуальны тур» і інш. Дадзеная акалічнасць выклікана, з аднаго боку, дынамічнымі канцэптуальнымі зменамі музейнай прасторы за кошт укаранення шырокага спектра мультымедыйных сродкаў. З другога боку – абазначылася трывалая тэндэнцыя да так званай віртуалізацыі музея ў медыяпрасторы, якая праяўляецца ў актывізацыі музейных інстытуцый у сацыяльных сетках (Facebook, Twitter, ВКонтакте, Одноклассники, Instagram і інш.), рэгістрацыі акаўнтаў на пляцоўцы YouTube, стварэнні віртуальных музеяў і г. д. Тым самым беларускія музеі паступова аказаліся ў цэнтры сацыякультурных трансфармацый як паўнавартасныя элементы складанага механізма трансляцыі артэфактаў культуры ў медыяпрасторы.

Апошнія падзеі, звязаныя з распаўсюджваннем пандэміі COVID-19, дэтэрмінавалі працэсы актыўнай ініцыяцыі музеяў

свету ў медыяпрастору. Гэта менавіта той час, калі ў экстрэмальных умовах востraга абмежавання жывых зносін з наведвальнікамі з’яўляецца магчымасць узнікнення разнастайных форм віртуальнай камунікацыі.

Улічваючы вышэйадзначаныя фактары, айчынныя музеі, у тым ліку кіруючыся агульнымі тэндэнцыямі лічбавых трансфармацый музейнай практыкі, прайшлі пэўнае выпрабаванне на гатоўнасць да інтэграцыі ў медыяпрастору. Як сведчанне дынамікі развіцця беларускіх музеяў у бок «пашырэння» сваёй прасторы, фармату і магчымасцей прэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны, разгледзім патэнцыял анлайн-праектаў беларускіх музеяў у пабудове камунікацыйнай стратэгіі як адной з форм трансляцыі артэфактаў культуры ў медыяпрасторы.

Музейныя праекты, што ажыццяўляюцца ў рэжыме рэальнага часу, прадстаўляюць адзін з прыкладаў новага ўзроўню камунікацыі, якая адбываецца ў фармаце максімальна прыбліжаным да жывых зносін, дынамічнага, нефармальнага прадстаўлення інфармацыі. Для ўдакладнення дэфініцый лічым патрэбным спыніцца на асэнсаванні паняццяў «музейны анлайн-праект» і «музейны віртуальны праект». У нашым разуменні існуюць пэўныя суадносіны паміж дадзенымі вызначэннямі. Рознасць сутнаснай прыроды адзначаных феноменаў праяўляецца ў мадэлі прадстаўлення і трансліравання інфармацыі ў медыяпрасторы кожнага з іх. Калі музейны анлайн-праект характарызуецца двухбаковасцю, дыялагічнасцю яго ўдзельнікаў, то трансляцыя музейнага віртуальнага праекта зводзіцца да аднабаковага прадстаўлення інфармацыі, дзе адваротная сувязь прысутнічае толькі ў выглядзе каментарыяў. Жывога ўзаемадзеяння віртуальных наведвальнікаў з музейным супрацоўнікам (стваральнікам кантэнта) у выпадку музейнага віртуальнага праекта не прадугледжана. Спецыфіка музейнага анлайн-праекта таксама заключаецца ў яго тэмпаральнасці (абмежаванасці па часе прэзентацыі) ў адрозненні ад музейнага віртуальнага праекта, які, як правіла, вылучаецца тыражаванасцю, здольнасцю да шматразовага паўтарэння. Інакш кажучы, і музейны анлайн-праект, і музейны віртуальны праект з’яўляюцца прыкладам «пашырэння» меж музея, трансфармацыі рэальнай музейнай прасторы ў віртуальную. Аднак найбольш блізкім фарматам да традыцыйнай музейнай

камунікацыі з усімі характэрнымі рысамі (такімі як дыялагічнасць, тэмпаральнасць, двухбаковасць ва ўзаемадзеянні з наведвальнікамі з'яўляюцца анлайн-праекты, якія, разам з іншымі формамі актыўнасцей у медыяпрасторы, атрымалі шырокае распаўсюджванне ў беларускіх музеях. Таму ў дадзеным кантэксце музейныя праекты, якія ажыццяўляюцца ў Інтэрнэце, становяцца найбольш актуальнымі.

Музейныя анлайн-праекты сталі значнай часткай у ажыццяўленні дзейнасці музеяў Беларусі па многіх напрамках дзейнасці.

Найбольшая відавая разнастайнасць азначаных праектаў назіраецца ў культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў Беларусі. Гэта анлайн-выстаўкі, экскурсіі, лекцыі, віктарыны і іншыя формы ўзаемадзеяння.

Падобныя мерапрыемствы прапануюць Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Віцебскі мастацкі музей, Музей гісторыі Магілёва, Мінскі абласны краязнаўчы музей, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей і іншыя музеі краіны.

Адным з яскравых прыкладаў арганізацыі альтэрнатыўных форм узаемадзеяння з віртуальнай аўдыторыяй з'яўляюцца анлайн-лекцыі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, арганізаваныя Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Анлайн-сустрэчы арыентаваны на аўдыторыю школьнікаў і даюць магчымасць вучням камунікаваць з супрацоўнікамі музея: задаваць пытанні, атрымліваць адказы і каментарыі, бачыць музейныя экспанаты. Ажыццяўленне анлайн-лекцый адбываецца пры дапамозе праграмы Skype. Галоўная карысць дадзенай формы прадстаўніцтва музея ў віртуальнай прасторы – гэта магчымасць дыялагічнага фармату камунікацыі [2].

Сярод айчынных музеяў таксама набылі папулярнасць анлайн-экскурсіі як па пастаяннай экспазіцыі, так і па выставачных праектах.

Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь запусціў цыкл анлайн-экскурсій па выстаўках «Вайна і мір. Вяр-

танне», «75 гадоў разам: Беларусь – дзяржава-заснавальнік ААН», адкрыццё якіх таксама трансліравалася ў прамым эфіры на платформе Instagram. Анлайн-трансляцыі таксама былі прысвечаны музейным прадметам са збору музея.

Цікавую акцыю прэзентаваў Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры. У межах праекта «Чытаем класіку разам» адбылося анлайн-чытанне рамана У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім», прымеркаванае да 90-годдзя з дня нараджэння класіка сучаснай беларускай літаратуры. Удзельнікі акцыі – вядомыя артысты, культурныя і грамадскія дзеячы, журналісты на працягу двух тыдняў з 13 па 29 красавіка 2020 г. у вызначаны час чыталі па адной з глаў вядомага рамана. Анлайн-чытанні можна было пачуць і ўбачыць на пляцоўцы YouTube [1].

Традыцыйная штогадовая акцыя «Ноч у музеі» з прычыны абмежаванасці жывой камунікацыі ў сувязі з распаўсюджваннем COVID-19 упершыню ў Беларусі прайшла ў анлайн-фармаце. Да Міжнароднага дня музеяў Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь ажыццявіў анлайн-праект «Museum backstage». У прамым эфіры супрацоўнікі музея пазнаёмілі віртуальных наведвальнікаў з працай музейных фондаў, рэстаўрацыйных майстэрняў і спецыфікай арганізацыі навуковых даследаванняў. Трансляцыя анлайн-акцыі адбывалася на афіцыйных старонках музея ў сацсетках, платформе YouTube [3].

Анлайн-акцыі да Міжнароднага дня музеяў прайшлі ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, Музеі «Замкавы комплекс “Мір”», Чачэрскім гісторыка-этнаграфічным музеі, Браслаўскім раённым аб’яднанні музеяў і інш.

Анлайн-праекты сталі актуальнымі і для навукова-даследчай работы музеяў Беларусі. Ажыццяўленне многіх навуковых канферэнцый, семінараў і іншых мерапрыемстваў таксама адбываецца ў рэжыме рэальнага часу.

Такім чынам, дынаміка ініцыяцыі айчынных музеяў у медыяпрастору, стварэнне віртуальных інтэрактыўных пляцовак у апошні час дэтэрмінавана не толькі агульнымі тэндэнцыямі да віртуалізацыі культуры і музейных устаноў у прыватнасці. Дадзены факт выкліканы таксама ўмовамі вострага абмежавання жывой камунікацыі з прычыны распаўсюджвання пандэміі COVID-19. Такія праекты набылі актуальнасць і маюць

патэнцыял адносна далейшага пашырэння межаў музеяў у медыяпрасторы, усталявання новага ўзроўню музейнай камунікацыі.

*1.* Анлайн-чытанне рамана Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» [Электронны рэсурс ] // Літаратурны музей Петруся Броўкі. – Рэжым доступу: http://brouka.museum.by/node/49703. – Дата доступу: 25.03.2021.

*2.* Онлайн-лекции [Электронный ресурс ] // Белорус. гос. музей истории Великой Отечественной войны. – Режим доступа: http://www.warmuseum.by/index.php/component/k2/item/1173-onlajn-lekcii. – Дата доступа: 24.03.2021.

*3.* Онлайн-проект «Museum backstage» [Электронный ресурс ] // Нац. худ. музей Респ. Беларусь. – Режим доступа: https://www.artmuseum.by/ru/news/night/mezhdunarodnyij-den-muzeev-v-naczionalnom-xudozhest-vennom-muzee.-museum-backstage.-2020/onlajn-proekt-museum-backstage.html. – Дата доступа: 24.03.2021.

*4. Себрукович, В. Ю.* Музей в условиях современных социокультурных трансформаций [Электронный ресурс] / В. Ю. Себрукович // Огарев-online. – 2019. – № 13. – Режим доступа: http://journal.mrsu.ru/arts/ muzej-v-usloviyax-sovremennyx-sociokulturnyx-transformacij. – Дата доступа: 24.03.2021.

**К. И. Сенько,** *аспирант.*
Научный руководитель – **Н. В. Бычкова,**
*кандидат искусствоведения, доцент*

## ПОНЯТИЕ ХУДОЖЕСТВЕННОГО ОБРАЗА МУЗЫКАЛЬНОГО ИНСТРУМЕНТА В ИСКУССТВОВЕДЕНИИ: СМЫСЛОВЫЕ ГРАНИ, ОБЛАСТЬ ПРИМЕНЕНИЯ

Художники и музыканты через свое творчество стремятся передать определенный образ. Воплотить его в музыке пытались неоднократно, однако кроме этого музыканты хотели выразить и свои зрительные впечатления. Со временем подход к передаче этих впечатлений менялся, но желание с помощью выразительных средств представить другой вид искусства оставалось тем же.

Понятие «художественный образ» восходит к эпохе Античности и актуально в настоящее время. Ученик Платона Аристо-